Вряд ли можно признать демократичным и предложенный порядок исключения из списка кандидатов. Ведь получается, что в любой момент руководитель партии или движения вправе прийти в Центральную избирательную комиссию и вычеркнуть фамилию кандидата из партийного списка.

В отличие от разработчиков БНФ, их оппоненты от ПНС избрали пропорциональную модель избирательной системы, причем ее наиболее демократичный вариант. Согласно ей, одномандатных избирательных округов быть вообще не должно. Выборы предлагается проводить как по партийным спискам, так и по спискам общественно-политических движений, избирательных блоков, организованных групп граждан. Для того, чтобы внести в список своего кандидата, потребовалось бы всего сто подписей избирателей. Малочисленные объединения, группы имеют право объединяться и составлять совместный список, включая в него тех людей, которых пожелают. Такой порядок позволяет добиться представительства в депутатском корпусе и небольшим партиям, движениям, объединениям и группам (при условии, разумеется, что их кандидатов поддержат избиратели). Их рейтинг, их политический вес, таким образом, зеркально отразится на составе советов всех уровней. Набрала та или иная партия 10 процентов голосов — пропорционально этому получает 10 процентов парламентских мандатов.

Разрабатываемый проект не предусматривает создания «тепличных условий» для лидеров партий и движений. По мнению его авторов, один кандидат может быть включен только в один список. Избиратель, получив бюллетень, будет иметь право определить не только партию, за которую голосует, но и конкретного ее кандидата, которому он отдает предпочтение перед другими.

Оригинальной представляется идея о порядке финансирования выборов. Предлагается, чтобы кредиты на проведение избирательной кампании государство выделяло всем партиям, движениям, объединениям граждан, участвующим в ней. Но с условием: если в результате выборов та или иная партия, объединение не получат установленного законом количества депутатских мандатов, деньги в казну придется возвратить. Это положение, надо думать, заставит жаждущих попасть в коридоры власти осмотрительно и серьезно подходить к участию в избирательной гонке.

...Работа над проектом Закона о выборах, который Партия народного согласия намерена представить на суд общественности и парламента, продолжается. И сейчас, разумеется, преждевременно давать окончательные оценки качеству еще только рождающегося важнейшего правового акта. Будем надеяться, что его творцы учли уязвимые и слабые места предложенного БНФ законопроекта и, образно говоря, выдадут на-гора действительно демократичный Закон о выборах, с помощью которого граждане суверенной Беларуси изберут высокопрофессиональный, пользующийся доверием и поддержкой нашего народа парламент, способный вывести республику из кризиса.

Останется, правда, один серьезный вопрос: а как отнесутся к законопроекту о выборах нынешние парламентарии, за какой закон они проголосуют?

Валерий ПОЛОТА, корр. «Згоды»

З ГІСТОРЫЯЙ НА ВЫ

За час работы ў архіве Камітэта Дзяржбяспекі Рэспублікі Беларусь неяк самі па сабе ўстанавіліся дзелавыя і чалавечыя адносіны з яго супрацоўнікамі.

У адну з творчых пауз, калі ветэраны службы Дзяржбяспекі часцей за ўсё ўспамінаюць мінулыя дні і справы, з намі ўступіў у размову нешматслоўны і заўсёды стрыманы палкоўнік запасу Георгій Пятровіч Афанасьеў, супрацоўнік архіва.

— Вы, сябры, як відаць, больш за ўсё цікавіцеся «Саюзам вызвалення Беларусі», але ў гэтым архіве ёсць нямала і іншых, не менш цікавых і каштоўных матэрыялаў. Напрыклад, на Канстанціна Езавітава. Спадзяюся, вы чулі пра гэтага чалавека, актыўнага дзеяча БНР, першага беларускага генерала.

— Безумоўна, чулі, але мала што ведаем пра ягоны лёс. Ды і як займець патрэбныя матэрыялы для азнаямлення, Георгій Пятровіч? Яны ж яшчэ пад грыфам «Зусім сакрэтна».

— Што датычыць грыфа, дык ён ужо зняты. І я гатовы іх вам паказаць.

І вось перад намі ў двух тамах так званая крымінальная справа. Сфарміравана яна была ў ходзе следства ў КДБ у красавіку 1945 — маі 1946 гадоў, г.зн. пасля арышту К.Езавітава ў Германіі савецкай ваеннай контрразведкай «Смерш». Пры арышце ў К.Езавітава смершаўцы забралі розныя дакументы і матэрыялы. Большая частка іх не мела істотнага значэння для следства, а таму у другой палове 40-х гадоў была перададзена ў спецфонд Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР.

Аднак шмат цікавых, у тым ліку і арыгінальных дакументаў па гісторыі беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху, у тым ліку і дзейнасці самога К.Езавітава, падшыта ў справе N 12602-с. Сярод іх ёсць кароткая, але жыва напісаная аутабіяграфія, а таксама ўласнай рукой Канстанціна Барысавіча выкладзеныя паказанні. У іх сумленна і дастаткова падрабязна, з безумоўным разлікам на будучых гісторыкаў, расказана пра падзеі, у якіх Езавітаў непасрэдна актыўна ўдзельнічаў.

Дзякуючы гэтым матэрыялам пра Канстанціна Езавітава — вядомага дзеяча беларускага нацыянальна-дэмакратычнага адраджэння, гісторыка, публіцыста, — нашы сучаснікі за апошні год даведаліся больш, чым было вядома аб ім за ўвесь пасляваенны час. Нарэшце, развеяліся міфы і легенды, што склаліся вакол абставін арышту і апошніх дзён яго жыцця, а таксама даты смерці.

К.Езавітаў нарадзіўся ў г.Дзвінску 5 лістапада 1893 г. Закончыў Віцебскі настаўніцкі інстытут у 1916 г. і ў тым жа годзе — Паўлаўскае ваеннае вучылішча. Удзельнік першай сусветнай вайны, ваяваў на Паўночным фронце. Быў выбраны намеснікам старшыні Беларускай вайсковай цэнтральнай рады. Удзельнік першага Усебеларускага кангрэсу. Вёў вялікую работу па фарміраванні беларускіх вайсковых часцей. У сакавіку 1918 г. удзельнічаў у абвяшчэнні БНР і ўвайшоў у склад яе рады. З"яўляўся народным сакратаром ваенных спраў у саставе першага нацыянальнага ўрада Беларусі. У 1919—1920 г г. — шэф Беларускай ваенна-дыпламатычнай місіі ў Латвіі і Эстоніі.

17 мая 1920 года Рада народных міністраў БНР прысвоіла яму званне генерал-маёра «за выдатную працу на карысць Беларускай Народнай Рэспублікі, выкананую ім за граніцай».

У 1921—1944 гг. — у Латвіі, настаўнічаў у беларускіх гімназіях і школах, займаўся публіцыстычнай дзейнасцю. У чэрвені 1944 г. на другім Усебеларускім кангрэсе быў выбраны у склад Беларускай цэнтральнай рады, з"яўляўся начальнікам Галоўнага ваеннага ўпраўлення і генеральным інспектарам «Беларускага вызваленчага войска».

Затрыманы контрразведкай «Смерш» 1-га Украінскага фронту 26 красавіка 1945 г. у г.Заганс (Германія). У час следства 23 мая 1946 г. памёр у шпіталі гарадской турмы МУС БССР «ад туберкулёзу лёгкіх пры дыстрафіі 3-й ступені».

Як відаць з кароткай біяграфічнай даведкі, фігура Езавітава, безумоўна таленавіта чалавека, шматгранная, складаная і супярэчлівая. Яна не можа быць ацэнена адназначна станоўча або негатыўна. Асабліва гэта датычыць перыяду Вялікай Айчыннай вайны, калі К.Езавітаў актыўна супрацоўнічаў з нямецкай ваеннай адміністрацыяй. Да таго ж у яго біяграфіі нямала «белых» плям.

Так, на допыце 26 красавіка 1945 г. ва ўпраўленні «Смерш» 1-га Украінскага фронту ён паказаў:

«С 1925 года по 1934 год я сотруднічал с полпредом Латвії Черных, после Ульяновым, под клічкой «Озол». В 1940 году под той же клічкой состоял в НКВД Латвійской ССР. В 1941 году в марте месяце меня вызвалі в Москву под предлогом представітеля профсоюзов, так как я состоял в руководстве профсоюза учітелей. Отправленіе в город Москву оформлял Іванов. Прі пріезде в город Москва меня на вокзале встретілі і отвезлі автомашіной в отель «Москва» і разместілі на четвертом этаже — імел переговоры с работнікамі НКГБ, с кем іменно сейчас вспомніть не могу. В разговорах мне подчерківалі, что должен связаться с белорусской эміграцією і работать среді ее так, чтобы постараться занять более высокое положеніе. С наступленіем военных событій мне удалось связаться с белорусской эміграцією в Берліне, а также в Мінске.

Запісано в протоколе с моіх слов все правільно, протокол мною прочітан, в чем і распісываюсь» .(Подпіс К.Езавітава)

Версія гэта або канстатацыя рэальнага факта? У тым і другім выпадку гэта патрабуе строга дакументальнага пацвярджэння або абвяржэння. Такія дакументы можна выявіць у архіве былога КДБ СССР.

У архіўнай справе К.Езавітава захаваўся машынапісны экземпляр успамінаў з яго аўтарскімі праўкамі аб першым Усебеларускім кангрэсе, які адбыўся ў Мінску ў снежні 1917 г., і ў рабоце якога ён удзельнічаў. Відавочна, мемуары былі падрыхтаваны для публікацыі ў нейкім беларускім выданні, пра што сведчыць перш за ўсё іх мова. Магчыма, яны былі напісаны ў канцы чэрвеня 1944 г. у акупіраваным немцамі Мінску ў час другога Усебеларускага кангрэсу. Бо раней, у студзені—верасні 1943 г. публікаваліся яго ўспаміны «25-я ўгодкі Усебеларускага Кангрэсу» ў газеце «Раніца», якая выдавалася ў Берліне. У той жа газеце надрукаваны яго «ўражанні і параўнанні» пра другі Усебеларускі кангрэс. Прапануемыя чытачам газеты ўспаміны К.Б.Езавітава «Першы Усебеларускі Кангрэс», па нашых звестках, раней не публікаваліся. Яны заставаліся ў асабістым архіве аўтара і былі канфіскаваны пры вобыску і арышце і знаходзяцца ў следчай справе ў архіве КДБ Рэспублікі Беларусь.

Пры ўважлівым чытанні ўспамінаў відаць, што яны не закончаны. Аўтар абяцаў падрабязна расказаць аб разгоне першага Усебеларускага кангрэсу, але па невядомых прычынах гэты сюжэт аказаўся не раскрытым. Між тым і ў даным выглядзе яны уяўляюць значную цікавасць і дапаўняюць новымі фактамі і штрыхамі важную старонку нацыянальнай гісторыі.

УЛАДЗІМІР МІХНЮК, ЯКАЎ ПАЎЛАЎ



Канстанцін ЕЗАВІТАЎ

ПЕРШЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІ КАНГРЭС

(Друкуецца з захаваннем арфаграфіі першакрыніцы).

5-га сьнежня 1917 году па старому стылю, або 18-га сьнежня па новаму стылю, адкрыўся ў Менску, у старым будынку гарадзкога тэатру, 1-шы Усебеларускі Кангрэс. На Кангрэсе гэтым прысутнічала 1872 дэлегаты, з якіх 1167 дэлегатаў мелі права пастанаўляючага голасу і 705 дэлегатаў былі дапушчаны толькі з правам дарадчага голасу, г.зн. ня мелі права галасаваньня.

Шматлюдны Кангрэс гэты адгуляў дужа вялікую ролю ў гісторыі змаганьня беларускага народу за стварэньне свае незалежнае дзяржавы. Ён закончыў першы перыяд беларускага адраджэнскага руху, перыяд паступовага нацыянальнага самаўсьведамленьня паасобных адзінак і ўтварэньня першых нацыянальных арганізацыяў, якія давалі магчымасьць згуртаваць нацыянальныя сілы народу і падрыхтаваць масавае выяўленьне волі народу. Вось жа 1-шы Усебеларускі Кангрэс быў гэтым выявіцелем волі ўсяго беларускага народу і ў сваім праўным і псыхалёгічным значаньні адгуляў ролю запраўднага Беларускага Устаноўчага Збору.

Адчыненьне Кангрэсу

Адчыненьне 1-га Усебеларускага Кангрэсу было дужа урачыстае. Пры дзьвярох будынку стаяла варта 1-га Менскага Беларускага палку, сцэна была упрыгожана нацыянальнымі сьцягамі і гэрбам Пагоні. У арганізацыйным прэзыдыюме Кангрэсу былі: прэзыдыюм Вялікай Беларускай Рады, на чале з Аркадзем Смолічам і юрыстам Язэпам Варонкай, прэзыдыюм Беларускай Цэнтральнай Вайсковай Рады, з Сымонам Рак-Міхайлоўскім на чале, і прадстаўнікі вялікшых беларускіх арганізацыяў: з Віцебску, Магілёву, Пецярбургу, Масквы, Кіеву і Адэсы.

За прэзыдыюмам на сцэне стаяў хор Тэраўскага, папоўнены артыстамі і артысткамі 1-га Беларускага Т-ва Драмы і Камэдыі, на чале з Флёрыянам Ждановічам і Фальскім. Да гэтага вялікага хору далучыўся яшчэ і хор Хаўрусу Беларускае Моладзі. Усе ў прыгожых нацыянальных уборах.

Заля, лёжы, усе бальконы, лёжа аркестры і нават частка праходаў у залі былі заняты дэлегатамі. Цывільныя вопраткі нашае інтэлігэнцыі, мундзіры афіцэраў, сьвіткі сялянаў, курткі работнікаў і гімнасьцёркі стральцоў рэпрэзэнтавалі ўсе станы беларускага народу, а сярод іх як мак гарэлі сьвяточныя убраньні некалькіх беларускіх грамадзкіх дзеячак і дэлегатак.

Кангрэс адчыніў Сымон Рак-Міхайлоўскі. Ягоная гарачая прамова глыбока ўсхвалявала ўсіх дэлегатаў і выклікала доўгія воплескі. Калі-ж затым аб"яднаны хор засьпяваў беларускі рэвалюцыйны гімн «Адвеку мы спалі і нас разбудзілі», дык шмат у каго з маладых і старэйшых нашых дзеячоў спаўзла па шчоках нечаканая, буйная і гарачая сьлязіна. Што да жанчынаў, дык ня было ніводнай, якая ня выхапіла-б хустачку і якая змагла-б стрымацца ад сьлёз.

Усе прысутныя ў залі адчувалі, што яны зьяўляюцца ўдзельнікамі аднаго з найвялікшых і найпрыгажэйшых мамэнтаў гісторыі Беларусі. Беларускі народ, вуснамі лепшых сваіх сыноў, рыхтаваўся выказаць свае жаданьні і сказаць сваё моцнае слова аб тым, як ён сам хоча пабудаваць сваё нацыянальнае і дзяржаўнае жыцьцё.

Парадак працы Кангрэсу

Пасьля выбару прэзыдыюму, у склад якога ўвайшлі ўжо ўспамінаныя вышэй асобы ды яшчэ прафэсар-акадэмік Яўхім Карскі, стары рэвалюцыйны дзеяч Бонч-Асмалоўскі, Язэп Дыла, Пётра Крачэўскі, Васіль Захарка ды яшчэ некаторыя іншыя, старшынства на Кангрэсе даручана было дохтару Івану Серадзе, сакратарыят — Тамашу Грыбу, а Мандатная камісія — Пётры Крачэўскаму.

Першы дзень быў цалкам аддадзены прывітальным прамовам і агалошаньню тых наказаў, якія былі дадзены розным дэлегацыям, а нават і некаторым паасобным дэлегатам з месц, ад іхніх мясцовых арганізацыяў. Увечары быў канцэрт хору Тэраўскага, які ўсім надзвычайна спадабаўся і моцна ўзрушыў нацыянальныя пачуцьці нават мала сьведамых адзінак. Па канцэрце была пастаўлена драма Ул.Галубка «Апошняе спатканьне», якую згулялі артысты «Т-ва Беларускае Драмы і Камэдыі».

Далейшую сваю працу Кангрэс перанёс у будынак Дваранскага Сабраньня, якое знаходзілася супроць будынку тэатру і мела вялікую залю для сходаў пленуму Кангрэсу ды шэраг меншых заляў і пакояў для сходаў розных камісыяў ды секцыяў, якія былі створаны на Кангрэсе для распрацоўкі паасобных пытаньняў. У гэтых малых залях адбываліся і сходы розных партыйных ды групавых фракцыяў, на якія пабіўся Кангрэс, бо на ім прадстаўлены былі розныя тагачасныя палітычныя напрамкі.

Палітычныя кірункі на Кангрэсе

Што да палітычных напрамкаў на 1-ым Усебеларускім Кангрэсе, дык, гледзішча на іхную колькасную і палітычную вагу на Кангрэсе, іх трэба падзяліць на тры аснаўныя групы: цэнтр, правае і левае крыло.

Цэнтр Кангрэсу складаўся з сяброў Беларускае Сацыялістычнае Грамады, якая мела на Кангрэсе кіруючую ролю і заваявала сабе большасьць дэлегатаў, прыхіліўшы да сябе і ўключыўшы ў свае шэрагі многіх дэлегатаў падчас працы самога Кангрэсу. Асабліва шмат увайшло ў ейны склад дэлегатаў з гэтак званае групы «безпартыйных», якая паступова разсасвалася на Кангрэсе, далучаючыся да партыйных групаў. Перайшлі ў фракцыю Беларускае Сацыялістычнае Грамады і значныя групы з былой расейскай партыі сацыялістых-рэвалюцыянераў. Наагул да БСГ, як партыі нацыянальнай і сацыялістычнай, імкнуліся ўсе беларускія сацыялістыя.

Правае крыло было найменшым па сваёй лічбе. Складалася яно з паасобных адзінак «старога закалу», з некаторых беларускіх арганізацыяў Усходняе Беларусі (Віцебская і Магілёуская) ды з нешматлічных клерыкальных груповак. Сюды-ж увайшлі і два-тры беларускія абшарнікі.

Левае крыло было даволі моцным, як сваёй лічбай, гэтак яшчэ і тэю энэргійнаю падтрымкаю, якую яно мела звонку ад гэтак званага «Областного Исполнительного Комитета Западной Области». Гэты Камітэт быў створаны падчас кастрычнікавай бальшавіцкай рэвалюцыі ў Менску і скарочана называўся «Облискомзап». Складаўся ён з расейскіх вайскоўцаў, якіх тады стаяла на Беларусі некалькі арміяў, з жыдоўскіх палітыканаў розных гатункаў і з латыскіх камуністаў. Абліскамзап не вызнаваў ні правоў беларускага народу на нацыянальнае самаазначэньне, ні беларускае мовы, ні нават самага існаваньня беларусаў, як народу і Беларусі, як асобнае краіны. Гэты Абліспкамзап, на чале якога стаяў прапаршчык Мясьнікоў, ішоў цалкам па шляхох старых расейскіх царскіх урадоўцаў-русіфікатараў.

Сваркі паміж камуністамі з поваду Усебеларускага Кангрэсу

Наяўнасьць шматлічных прыфрантовых і тылавых штабаў у Менску, а таксама вялікая колькасьць розных прадстаўніцтваў і ўстаноў Усерасейскага Земскага і Гарадзкога Саюзаў ад 1915-га году літаральна залівала Менск чужымі наездымі з Расеі элемэнтамі. Гэтыя элемэнты напаткалі ў Менску аграмадныя масы жыдоў, якія мелі тутака лічэбную перавагу над беларусамі і трымалі ў сваіх рукох усю прамысловасьць, гандаль, рамесьніцтвы, вольныя прафэсіі і прэсу. Прадстаўнікі беларускае народнае інтэлігэнцыі былі змабілізаваныя ў войска і знаходзіліся на далёкіх франтох, або былі эвакуіраваныя са сваімі ўстановамі аж на Волгу.

У гэткай ненармальнай абстаноўцы, калі ў Менску не выхадзіла нават беларуская газета, заўважыць беларускія элемэнты ў перапоўненым войскам і чужынцамі горадзе было для чужога чалавека цяжка, асабліва-ж калі гэты чужак нават і не жадаў нічога заўважацьі бачыць. Дык расейскія сацыялістырэвалюцыянеры, якія захапілі ўладу ў Менску напачатку 1917-га году, а затым і бальшавікі, якія пасьля кастрычнікавага перавароту адабралі ад эс-эраў гэтую уладу, зусім не жадалі лічыцца з беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі і не дацэнівалі шпаркі ўзрост і гуртаваньне беларускіх сілаў.

Цэнтральныя бальшавіцкія ўстановы, якія на прыкладзе Фінляндыі, Украіны, Грузіі і польскіх легіёнаў пераканаліся ў тым, якую колёсальную сілу маюць нацыянальныя рухі, шукалі спосабу як-колечы бяз адчыненае сваркі і канфлікту заўладаць беларускім рухам і накіраваць яго калі ўжо ня цалкам на сваю карысьць, дык прынамсі ў нейкае неўтральнае ручво.

Таму паміж цэнтральнымі бальшавіцкімі ўстановамі і бальшавіцкай уладай на мяйсцох ішлі войстрыя спрэчкі ў справе тактыкі ў адношаньні да беларусаў і іхніх вайсковых фармаваньняў. Цэнтральныя ўстановы ў Пецярбурзе і Стаўка вярхоўнага галоўнакамандуючага прапаршчыка Крыленка ў Магілёве давалі на поўных умовах дазвол на фармаваньне беларускіх вайсковых адзінак, а Аблікамзап абязброіваў тыя часткі, якія траплялі ў Менск.

Тое самае было і з Усебеларускім Кангрэсам: Цэнтральныя бальшавіцкія ўстановы ў Пецярбурзе згаджаліся з тым, што Кангрэс на пэўных умовах можа адбыцца, каб на аснове самаазначаньня народаў вывіць волю беларускага народу, а Аблікамзап у Менску быў нават супроць дапушчэньня да скліканьня Кангрэсу.

(Працяг будзе).

На здымку, што дайшоў да нас з далёкага 1902 года, — адзін з найвыдатнейшых людзей Беларусі — Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі. Такім мы яго яшчэ не ведаем: друкаваліся фотаздымкі сталага ўзросту. Гэты ж, знойдзены ў Пецярбургскім гістарычным архіве прафесарам Э.Савіцкім, публікуецца ўпершыню.

Угледзімся: спакойны, удумлівы, мужны і прыгожы твар. Позірк у бок ад фатографа. Напрошваецца: быццам углядаецца ў далячынь свайго лёсу. Але ж наўрад ці. Толькі дваццаць адзін.

Свой лёс ён складзе сам. Аднак у абставінах, прапанаваных жорсткай эпохай грандыёзнай сацыяльнай ломкі. Таму і выдаўся ён такім складаным, супярэчлівым, драматычным, з крутымі паваротамі. Але ж і шчаслівым па вялікаму разліку.

Актыўны дзеяч беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, адзін з заснавальнікаў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, член яе ЦК. Заснавальнік Беларускай камуністычнай арганізацыі (БКА), што вяла барацьбу супраць польскай акупацыі. Нарком асветы БССР. Член Бюро ЦК КП(б)Б. Першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук. Ідэолаг і арганізатар палітыкі беларусізацыі ў 20-ыя. Вучоны, чые лекцыі ў БДУ і чые даследаванні заклалі падмурак беларускай гістарычнай навукі.

І — «нацдэм», «нацыянал-ухіліст», «вораг народа» ў канцы тых жа 20-х.

4 лютага 1931 года стрэлам з браўнінга ён сам патушыць яркі ліхтарык свайго жыцця. Каб не скарыцца сцюдзёным ветрам хлусні і знявагі, каб не здрадзіць сабе і свайму народу.

...Але ўсё гэта, як і сённяшняе трыумфальнае вяртанне пасля паўвекавога нябыту,— наперадзе.

На здымку ж з далёкага 1902 года Усеваладу Ігнатоўскаму толькі дваццаць адзін.

ЯДНАННЕ

Усё больш шырокімі і змястоўнымі становяцца сувязі Рэспублікі Беларусь з беларускай дыяспарай. Сведчанне таму і новы крок на гэтым шляху яднання — сустрэча грамадскасці Беларусі з прадстаўнічай дэлегацыяй беларусаў замежжа, якая адбылася 29 ліпеня ў Доме літаратара. Наладзіла яе згуртаванне «Бацькаўшчына». Яно ж выступіла ініцыятарам правядзення Сусветнага кангрэса беларусаў у чэрвені 1993 г. Для яго падрыхтоўкі на сустрэчы быў створаны Каардынацыйны камітэт, у які ўвайшлі прадстаўнікі шэрагу дзяржаўных органаў, дэмакратычных партый, рухаў і арганізацый, творчай інтэлігенцыі, навукоўцаў. Узяць на сябе абавязкі кіраўніка камітэта па аднадушнаму запрашэнню прысутных згадзіліся народны пісьменнік Васіль Быкаў і міністр замежных спраў Пётр Краўчанка.

На сустрэчы госці і гаспадары падзяліліся сваімі думкамі аб развіцці сувязей, сучасным становішчы на Беларусі, перспектывах нацыянальнага адраджэння. Завяршылася сустрэча цудоўным сумесным канцэртам.

КОМУ ЖЕ ДОВЕРИТЬ ВЛАСТЬ НАД НАМИ?

Жизнь, созданная на земле таинственными, безграничными силами Природы, содержит в себе множество противоречий. В человеческом обществе к их числу можно отнести, прежде всего, несоответствие между заложенным в инстинкт людей стремлением к размножению и ограниченными возможностями Земных ресурсов, конфликтность все нарастающего потребления индивидуумами с возможностями их сообществ, то есть личного и общественного. При неразрывном переплетении личного потребления с общественным производством и наличии инстинкта творческих поисков во имя совокупного выживания и улучшения личного бытия Природа предусмотрела и непременные регуляторы. Они — в осознании необходимости руководящих структур в обществе. В этом направлении высшим силам пришлось немало потрудиться, непрерывно усложняя поисковый процесс. В результате, поднимаясь по ступенькам совершенствования, человечество прошло путь от управления первобытными стадами, племенами до нынешних форм руководства общественными объединениями, включая государственные и межгосударственные. Формы эти циклично менялись: императорское (фараонское, королевское, царское и др.) правление вытеснялось демократиями. Последние, ввиду их несовершенства, уничтожались диктаторами, которые в свою очередь низвергались недовольными слоями населения. Народы платили за такие поиски дорогой ценой. Эти поиски, дополненные стремлением добывать средства жизнеобеспечения методами грабежа других народов, сопровождались кровавыми драмами: войнами, разрушительными революциями, насильственными навязываниями другим образа жизни по своему подобию.

Все революционные преобразования, начиная с Великой французской революции, проводились под лозунгом разрушения старого мира «до основанья», классовой борьбы. Однако опыт истории показал, что классовая борьба ведет только к взаимному уничтожению людей. Каждый разумный человек понимает, что бороться нужно со стихийными бедствиями, преступностью, болезнями и другими явлениями, мешающими нормально жить, а не с людьми другого социального сословия. Иначе — социальная война, военное положение для целых поколений.

Все сказанное обязывает нас глубинно заглянуть в историческое прошлое, в тернистый путь человека. После отнесения душевно прочувствованных ценностей жизни на фон настоящего и будущего можно сделать следующие выводы.

Миром должен править Разум, озабоченный лишь «малым»: сохранением жизни на Земле, жизненными проблемами настоящего и будущих поколений человечества. Этот Разум должен формироваться по крупицам представителями всех социальных слоев: и рабочими, и крестьянами, и предпринимателями, и, конечно, мозгом любого человеческого сообщества — интеллигенцией.

Непосредственная демократия неспособна создать условия для торжества Разума. Она породит непременно охлократию, при господстве которой законы толпы, стихийные общественные порывы не только помешают выбору достойных, наиболее перспективных путей улучшения жизни, но и могут стать орудием всеобщего разрушения. Поэтому только представительная демократия, способная формировать меньшинство, которое может вести за собой большинство, указывать пути развития общества, по-настоящему прогрессивна. Однако у нас нет хороших примеров этой формы демократии. Советы всех уровней в нашей республике пока не снискали авторитета ни у населения, ни у специалистов-политологов.

По-настоящему представительная демократия невозможна без наличия свободно, но в рамках нравственности конкурирующих партий. Эти партии, различаясь между собой в поисках путей движения к нему, должны быть в одинаковых условиях и, главное, подчинены общей цели: интересам народа, общества, избирателей. Но, к сожалению, мы еще лишь формируем такую общественно-политическую, нравственно-политическую ситуацию. Нынешнее обилие маломощных партий без сплачивающих идей далеко от того, что нужно обществу.

Формирование направляющего меньшинства, способного повести за собой большинство, предполагает выдвижение соответствующих лидеров. Цивилизованный мир выбирает их цивилизованными путями в виде руководителей государств, правительств, партий, авторитетных публицистов. Однако в нашей республике подбор лидеров сильно осложнен все еще мощным прессом давления на сознание людей прежних методов большевизма. Поднятые хаосом «перестройки» новые (из прежних функционеров КПСС) лидеры, взращенные большевизмом, не вобравшие в себя ни общечеловеческих ценностей, ни реальных интересов своего народа, вряд ли смогут повести за собой большие общности людей.

Отсутствие политических лидеров общества запутало очень важные исходные положения его развития. В результате все внимание основной массы людей обращено на личные усилия, на индивидуальные, в ином случае — групповые методы удовлетворения своих материальных и социальных интересов. Независимой Беларуси нужны авторитетные лидеры, на которых смогли бы ориентироваться большие социальные группы населения.

Алексей СОЛОМОНОВ,
профессор

Дык хто ж намі будзе кіраваць? Каму мы згадзіліся б даручыць свой лёс у гэты няпэўны час, каго б мы хацелі бачыць на чале ўрада Рэспублікі Беларусь? З такімі пытаннямі рэдакцыя вырашыла звярнуцца да чытачоў.

УВАГА! ПАЛІТЫЧНЫ ПРАГНОЗ-КОНКУРС ЧЫТАЧОЎ!

Рэдакцыя газеты «Згода» сумесна са спонсарамі прапануюць адказаць на пытанні анкеты (анкету даслаць да 10.IX.1992 г. па адрасу: 220041, г.Мінск, пр-т Скарыны, 79. У наступным нумары газеты анкета будзе паўторана).

Да 15 верасня рэдакцыя апублікуе вынікі анкеты. У наступны ж дзень пасля ўтварэння новага ўрада будуць вызначаны пераможцы. Спонсары выдзелілі для іх узнагароды: халадзільнікі «Мінск» (можа, каб астудзіць палітычную заўзятасць?), а для непаўналетніх палітолагаў (калі такія будуць сярод пераможцаў) — ляльку «Барбі» кожнаму.

1. Калі, на Ваша меркаванне, адбудзецца чарговая змена ўрада РБ (год, месяц)?

_____

2. Па якой прычыне гэта адбудзецца (па волі цяперашняга ВС, пасля выбараў новага парламента, у сувязі з пагаршэннем эканамічнага становішча людзей і г.д.)?

_____

3. Хто ўзначаліць новы ўрад (імя, прозвішча)?

_____

ПОЧЕМУ ПРИШЛОСЬ ПРОДЛИТЬ ПРИЗЫВ В АРМИЮ

Несколько лет назад здесь был бы уместен иной заголовок. Скажем, «Весенний призыв». Но времена меняются. В разгаре — лето, а у военкоматов до недавнего времени было оживленно. В чем дело? Об этом беседа с начальником отдела комплектования организационно-мобилизационного управления штаба Министерства обороны Республики Беларусь полковником Е.Бельдяевым.

— Евгений Анатольевич, согласно постановлению Совета Министров Беларуси, призыв в армию должен был завершиться 30 июня. Но...

— Но был продлен до 20 июля. В связи с тем, что заканчивались выпускные экзамены в техникумах, профессионально-технических училищах, других учебных заведениях. К тому же в этом году призыв идет туго. Хотя призыв и был продлен, 1160 человек так и не явились на призывные пункты. И все же установленный Советом Министров план призыва мы выполнили на сто процентов.

— У нас свои Вооруженные Силы. Казалось бы, проблем не возникнет. Ведь не прежние «необъятные просторы» защищаем, а родную землю, отчий дом...

— Однако прагматизм берет свое. Сейчас срок службы составляет 2 года. В ближайшей перспективе он будет сокращен до 18 месяцев. Парламент, как известно, в первом чтении одобрил соответствующий закон. Он дорабатывается и будет, по всей вероятности, принят на ближайшей сессии Верховного Совета. Вот некоторые призывники и выжидают, ищут лазейки, чтобы отправиться в армию осенью, всячески лавируют.

— Как славируешь, если есть Закон «О всеобщей воинской обязанности»?

— В Беларуси такового пока нет. А закон бывшего СССР практически не действует. По решению правительства он должен «работать» в полную силу, ибо не противоречит нашему законодательству. Тем не менее прокуратура осторожничает, и ее можно понять. Ведь того Союза уже нет, мы живем в самостоятельном государстве. Образовавшийся правовой вакуум отдельные призывники используют в своих целях. Не лучших для армии и обеспечения безопасности республики.

— За неявку в военкомат вроде бы положен штраф...

— Десять рублей. Разве такой суммой когонибудь сегодня испугаешь? Тем более молодого кооператора, предпринимателя.Особенно в Гродненской области много таких среди призывников. Уедет в Польшу и торгует там, а ты ищи-свищи...

— Будем надеяться, Евгений Анатольевич, что в конце концов наши законотворцы ликвидируют правовой вакуум. И все-таки хватит ли молодого пополнения для обеспечения жизнедеятельности войск?

— Трудности ощущаются, но не настолько, чтобы кричать: «Караул!». Совершенствуется организационно-штатная структура Вооруженных Сил Беларуси. Там, где она изменена применительно к новым условиям, укомплектованность уже сегодня стопроцентная.К весне следующего года, благодаря дальнейшему реформированию, проблема вообще исчезнет.

— Каким видится будущий призывник?

— Здоровым, крепким. Пока предостаточно хлюпиков. Вот цифра, над которой, право же, стоит задуматься: 2,5 тысячи юношей не могут быть призваны в армию из-за слабого здоровья и различных болезней. На лечение призывников не хватает медикаментов, даже анализы нечем делать. В больницу на обследование положить — тоже не просто, ибо там хозрасчет, а платить за призывника некому.

Выход один: государственные органы должны наконец-то повернуться лицом к допризывной молодежи. Пора здесь не разрушать, а создавать. У нас сплошь и рядом закрываются стрелковые тиры, забыты военно-спортивные лагеря, физическая закалка в школах запущена донельзя. По сути, свернуто патриотическое воспитание.

— Во многих странах мира солдаты служат недалеко от дома...

— Принцип-то у нас был экстерриториальный. Чем дальше направляли, тем, считалось, лучше. Теперь на территориальный принцип перешли. Призывники из Беларуси служат в своей республике. Даже больше. В основном направляем их в воинские части, расположенные поблизости от дома. Пусть воинов навещают родители, близкие, друзья, пусть не прерывается связь с трудовыми коллективами. Думается, выигрыш будет обоюдным.

ВЛАДИМИР РУДЕНКО

Заснавальнікі:

Партыя народнай згоды, калектыў рэдакцыі.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не абавязкова супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Тэлефоны:

рэдактар--Леанід ЛОЙКА, тэл. 32-35-94;

супрацоўнікі рэдакцыі:

Аляксей КАРОЛЬ, тэл. 32-01-84;

Ігар РЫЖКОЎ, тэл. 32-04-31

Рэдакцыйная калегія

Друкарня «Победа», 222310, г. Маладзечна, вул. Тавлая, 11. Индэкс 63138, тыраж 5000 экз.